■ Жніво-2017

## МІЛЬЁН І ЯШЧЭ 74 ТЫСЯЧЫ

**...тон збожжа — такі вынік сёлетняга жніва на Магілёўшчыне.**

Магілёўскія аграрыі паспелі завяршыць уборачную кампанію яшчэ да таго, як на вобласць абрушыўся дождж. Шклоўскі раён стаў абсалютным лідарам і па ўраджайнасці — 78,8 цэнтнера з гектара (ААТ «Александрыйскае»), і па колькасці сабранага ўраджаю — 133,6 тысячы тон. На другім месцы Магілёўскі раён з ураджайнасцю 74,5 (ЗАТ «Агракамбінат «Зара») і 124,4 тысячы тон збожжа. Болей чым па 65 цэнтнераў з гектара збіралі аграрыі аграгаспадарак «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна і «Кастрычнік» — Мсціслаўскага.

Першымі ў краіне пяць тысяч тон збожжа намалацілі экіпажы камбайнераў ЗАТ «Агракамбінат» Зара» — бацька і сын Уладзімір і Вадзім Корсакі, а таксама Уладзімір Мельнікаў і Аляксей Макосаў. Столькі ж збожжа перавезлі ад камбайнаў кіроўцы гэтага агрcraпрадпрыемства Юрый Манкевіч і Хасія Лангуры. Па пяць тысяч тон збожжа перавезена і кіроўцамі Шклоўскага раёна Віталем Цемруком (ЗАТ «Амкадор-Шклоў») і Ігарам Ярашовым ААТ «Александрыйскае».

Але тэмп сельскагаспадарчых работ на Магілёўшчыне не зніжаецца. Як паведамілі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, зараз поўнай хадой ідзе ўзорванне зябліва пад азімыя, пасеў азімага рапсу, уборка бульбы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Заробкі

## ПЛЮС ДВА РУБЛІ

### Тарыфная стаўка першага разраду павялічыцца

**З 1 верасня тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і прыроўненых да іх вырасце на 6,5 працэнта — з 31 да 33 рублёў. Пры гэтым памеры карэкціруючых каэфіцыентаў, штомесячных дыферэнцаваных даплат не зменяцца.**

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый даручана пералічыць заробкі работнікаў у адпаведнасці з новай тарыфнай стаўкай і каэфіцыентамі. Змены закрануць 859,2 тысячы чалавек — столькі беларусаў, па звестках Белстата, працуе ў бюджэтнай сферы.

Апошні раз стаўка тарыфнага разраду павышалася 1 студзеня гэтага года. Тады ж былі ўстаноўлены штомесячныя дыферэнцаваныя даплаты работнікам бюджэтных арганізацый, тарыфікуемых 1—14 разрадамі, у памерах 8,6—5,7 рубля.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Ці ўсё вас задавальняе ў аптэцы?

### Праходзіць экспрэс-маніторынг рынку лекавых сродкаў

**Для яго правядзення (цэны, даступнасць, наяўнасць) у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю па 18 верасня адкрыта гарачая лінія.**

Па тэлефоне (8 017) 200 92 02 грамадзяне могуць паведамляць аб фактах росту цэн, розных цэнах на адны і тыя ж лекі ў розных аптэках (з указаннем суб'ектаў гаспадарання, іх адраса), іх адсутнасці ў продажы, а таксама аб іншых праблемных пытаннях адносна забяспечанасці насельніцтва лекавымі сродкамі. Юрыдычныя асобы могуць паведамляць аб праблемных пытаннях, што маюцца, у плане вядзення бізнесу ў фармакалагічнай галіне. Кожны факт будзе вывучаны, абяцаюць у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Пры неабходнасці будуць прыняты меры ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Рэжым работы гарачай лініі: у рабочыя дні з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 18.00.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Фестывалім

## ДА РАДЗІМІЧАЎ — У ГОСЦІ

**...запрашае на гэтыя выхадныя Чавускі раён. У аграгарадку Радамля прапануюць перанесціся на некалькі стагоддзяў назад — у старажытны горад радзімічаў.**

Эпоху будуць ствараць тэатралізаваны наказ «Падарожжа ў сівую даўніну», паказальныя баі вікінгаў перыяду ранняга Сярэднявечча, этнатанцы і іншыя забавы. Настрой святу зададуць гурты з Мінска «Хмяльны Вір», «HardWood», дуэт беларускай і сярэднявечнай музыкі «Дзівабор».

Нагадаем, што ініцыятыва «Радамля — старажытны горад радзімічаў» рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» і фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Спонсарскую падтрымку атрымала і ініцыятыва «Экалагічны турызм для развіцця патэнцыялу Чавускага раёна», што дапамагло распрацаваць пазнавальны водна-пешы маршрут Новаягораўка — крыніцы Байкава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о повторном открытом аукционе по продаже**
**административно-хозяйственного здания,**
**г. Минск, пр-д Бетонный, 13**

Лот №1. Здание административно-хозяйственное с инв. №500/С-5079. Назначение: здание административно-хозяйственное. Г.п. – 1949; Этажность – 2; Общая площадь – 634,2 кв. м. Фундамент – бетонный; Стены наружные и внутренние – кирпичные; Перегородки – кирпичные; Перекрытия – деревянные; Крыша – металлический профнастил; Полы – дощатые, плиточные, линолеумные, ламинат; Проемы оконные – двойные деревянные, стеклопакеты; Проемы дверные – филенчатые, щитовые; Наружная отделка – оштукатурено, окрашено; Внутренняя отделка – окрашено, облицовано, оклеено обоями; Отопление – есть; Водопровод, канализация – есть; Электроснабжение – скрытая проводка; Вентиляция – естественная.

**Начальная цена продажи – 325 620,00 бел. руб.**
**Задаток – 32 560,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%**

СВЕДЕНИЯ О ЗЕМЕЛЬНОМ УЧАСТКЕ

Земельный участок с кадастровым номером 500000000005001831, расположенный по адресу: г. Минск, пр-д Бетонный, 13, пл. 0,0955 га. Назначение – эксплуатация и обслуживание административного здания. Право постоянного пользования.
ОБРЕМЕНЕНИЯ: охранная зона водовода, пл. 0,0955 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ эксплуатирующим организациям владельцам инженерных коммуникаций, пл. 0,0955 га

ОБРЕМЕНЕНИЯ

1. Ипотека. В случае продажи с публичных торгов имущества, являющегося предметом ипотеки, ипотека прекращается в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
2. Запрещение. Запрет на отчуждение на основании постановления ОПИ Московского района города Минска от 05.04.2017 №б/н.
3. Запрещение. Запрет совершения регистрационных действий на основании постановления ОПИ Московского района города Минска от 18.08.2017 №б/н.
4. Арест. Постановление ИМНС Республики Беларусь по Московскому району г. Минска от 11.08.2016 №001927. Арест будет снят в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после реализации Объекта с публичных торгов (торгов)

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объекты по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе имущества не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, имущество должника, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 22.09.2017 г. в 11.00 по адресу:**
**Республика Беларусь, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот №1), проводимом 22.09.2017 (Фрунзенский МРО).
Организация и проведение аукциона, а также оформление и регистрация сделки осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в г. Минске, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00. Окончание приема заявлений – 20.09.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: ген. директор ОАО «Спецремонт» Федосенко Виктор Михайлович 8-017-213-62-05; 8-017-208-27-17

Контакты организатора аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550 09 52, 8 (029) 550 09 59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • torgi@ino.by

■ Футбол

## АМАЛЬ ЯК У КІНО

### Футбалісты БАТЭ прабіліся ў групавы раўнд Лігі Еўропы

**Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што барысаўчане па суме дзвюх сустрэч абыгралі украінскую «Александрыю».**

Нагадаем, першы матч на «Барысаў-Арэне» скончыўся з лікам 1:1, а вось на поле ўкраінскага клуба падапечныя Аляксандра Ермаковіча вырвалі перамогу ў «Александрыі» — 2:1. Хоць пачатак гульні склаўся зусім няўдала: пасля парушэння правілаў Станіславам Драгуном у штрафной плошчы пенальці рэалізаваў украінец Васіль Грыцук. Аднак стараннямі Міркі Іваніча БАТЭ вярнуўся ў гульню, першы раз ён паразіў вароты на 70-й хвіліне, а праз тры хвіліны афарміў галявы дубль.

*— Для нас матч склаўся. Сцэнарый у яго быў амаль як у кіно. Няўдалы пачатак і шчаслівы канец, — адзначыў* **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр Ермаковіч.** *— Цяжка ўваходзілі ў гульню. У першым тайме «Александрыя» дамінавала, стварыла больш момантаў, аказвала ціск. Вельмі рады, што здолелі пераламаць гульню. Каманда праявіла характар, я ганаруся іх дзеяннямі ў другім тайме. Мы вельмі задаволеныя: у няпросты час перамагчы і выйсці ў групу — дарагога варта.*

Тым часам у Манака адбылася жараб'ёўка групавой стадыі Лігі Еўропы — 2017/18. Барысаўскі БАТЭ выступіць у квартэце H, дзе пазмагаецца з лонданскім «Арсеналам», нямецкім «Кёльнам» і «Црвенай Звездай» з Бялграда. Гульні групавога этапу пачнуцца 14 верасня і скончацца 7 снежня.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

## ЗОЛАТА НА ДЫВАНЕ

### Ванеса Каладзінская стала чэмпіёнкай свету па спартыўнай барацьбе

**Планетарны форум праходзіць у гэтыя дні ў Парыжы. У вагавай катэгорыі да 53 кг Ванеса спачатку ўпэўнена адолела Юлію Леорду з Малдовы, у наступным раўндзе беларуска не пакінула шанцаў Марыі Прэваларакі з Грэцыі, на стадыі паўфіналу была мацнейшай за Эстэр Добрэ з Румыніі і нарэшце ў фінале Каладзінская адолела Маю Мукаіду з Японіі.**



Нагадаем, што ў гэтым сезоне Ванеса стала чэмпіёнкай Еўропы ў Сербіі, таксама ў яе актыве ўжо ёсць залатая медаль чэмпіянату свету ў 2012 годзе.

Узнагарода Ванесы Каладзінскай стала першай залатой у скарбонцы беларускай каманды на сусветным форуме. Усяго ж на рахунку нашых спартсменаў ужо чатыры медалі. Раней прадстаўнік грэка-рымскага стылю Радзік Кулieў (80 кг) стаў сярэбраным прызёрам. Другое месца ў катэгорыі 75 кг заняла Васіліса Марзалюк, бронзавы медаль у Ірыны Курачкінай (55 кг).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Крушэнне двух паромаў у Бразіліі прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр

У Бразіліі расце колькасць загінулых людзей у выніку крушэння двух пасажырскіх паромаў.

Як паведамляюць інфармагенцтвы, ахвярамі двух надзвычайных здарэнняў на вадзе сталі 41 чалавек. Першая трагедыя адбылася 23 жніўня. Тады ў штаце Пара на поўначы краіны затануў паром. На яго борце знаходзілася 70 чалавек, у тым ліку экіпаж. У выніку загінулі 19 чалавек, 23 удалося выратавацца, яшчэ 7 прапалі без вестак. Устаноўлена, што судна не мела дазволу на перавозку пасажыраў. Другая трагедыя адбылася напярэдадні на ўсходзе Бразіліі. Судна, якое рухалася з Мар-Грандзі ў Салвадор, перавярнулася ў заліве Тодус-ус-Сантас. Са 130 пасажыраў, якія знаходзіліся на борце, 22 чалавекі загінулі, 21 быў выратаваны. Пошукава-выратавальная аперацыя працягваецца.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Бразіліі Мішэлу Тэмеру, а таксама родным і блізкім загінулых у выніку караблекрушэнняў на рацэ Амазонка і ў Атлантычным акіяне.**

### Ахоўнікаў Пенса пакаралі за тое, што яны ўпотай правялі жанчын у гатэль

Некалькі амерыканскіх ваенных адхілены ад аховы Белага дома за праступак, учынены падчас нядаўняга лацінаамерыканскага турнэ віцэ-прэзідэнта ЗША Майкла Пенса. Гэтыя ваенныя ўпотай прывялі жанчын да сябе ў гатэль у Калумбіі, дзе павінен быў спыніцца віцэ-прэзідэнт, паведаміла тэлекампанія NBC.



Паводле іх звестак, парушэнне выявілі супрацоўнікі апарату віцэ-прэзідэнта ЗША, прагледзеўшы запісы камер відэаназірання ў гасцініцы.

Тэлекампанія ў гэтай сувязі нагадвае, што сакрэтная служба ЗША, якая забяспечвае бяспеку першых асоб дзяржавы, апошнім часам скаланае чарада гучных скандалаў, выкліканых непрыстойнымі паводзінамі яе персаналу, у тым ліку п'янства і сувязі з прастытуткамі, а таксама неналежнае выкананне службовых абавязкаў. Гэтыя здарэнні каштавалі пасады папярэдняму кіраўніку сакрэтнай службы Джуліі Пірсан.

### Амерыканка выйграла ў латарэю 759 мільёнаў долараў

Выйгрышны білет латарэі Powerball, джэкпот якой склаў 758,8 мільёна долараў, быў набыты ў прадуктовай краме ў горадзе Уотэртаўн (штат Масачусэтс). Гэта самы вялікі выйгрыш, які выпаў на адзін білет, у амерыканскай гісторыі, паведамляе CNN Moneny.

Пераможцай аказалася маці дваіх дзяцей Мэвіс Венца. Яна больш за 30 гадоў працавала ў шпіталі, але даведаўшыся, што разбагацела, адразу патэлефанавала свайму начальніку і сказала, што звальняецца. Што рабіць з такой кучай грошай, жанчына яшчэ не вырашыла. Пакуль хоча проста адпачыць.

Паводле звестак арганізатараў, выйгрышнымі нумарамі сталі 6, 7, 16, 23, 26, а бонус — лік 4. Яшчэ шэсць шчаслівчыкаў, нумары квіткоў якіх супалі з імі няпоўнасцю, выйгралі па 2 мільёны долараў, а 34 удзельнікі розыгрышу — па 1 мільёне.

Згодна з правіламі, пераможца можа атрымаць джэкпот часткамі на працягу 29 гадоў ці стаць яго ўладальнікам адразу. У апошнім выпадку сума выйгрышу становіцца прыкладна ў два разы меншай, без уліку памеру падаткаў.

Шанцы выйграць складаюць прыкладна 1 да 292 мільёнаў. Латарэя Powerball праводзіцца ў 44 штатах, федэральнай акрузе Калумбія, на амерыканскіх Віргінскіх астравах і ў Пуэрта-Рыка. Цана квітка складае 2 долары, а агульная выручка ад іх продажу складае некалькі мільярдаў долараў.